СОЮЗ ЕВРАЗИЯ

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

27 ВЕРАСНЯ 2016 г. АЎТОРАК № 186 (28296)

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА




**Патэнцыял — вялізны**



**Дождж, што павышае кошты**

СТАР. 13



**Пагуляем у «Фінансавы футбол»**

СТАР. 14—15

*ЦЫТАТА ДНЯ*



**Міхаіл ПАРТНОЙ, намеснік міністра спорту і турызму:**

*«Цяпер прапрацоўваецца магчымасць бязвізавага ўезду і часовага знаходжання для грамадзян краін, бяспечных у міграцыйным плане, на тэрмін да 5 сутак, якія прыбываюць праз Нацыянальны аэрапорт Мінск. Гэтую ініцыятыву актыўна падтрымліваюць Мінэканомікі, МЗС, Мінспорту. Ёсць пэўныя сумневы з боку сілавых ведамстваў. Зразумела, што бяспека краіны — у першую чаргу. Але, разам з тым, дакумент у высокай ступені гатоўнасці. Я мяркую, што ён уступіць у сілу сёлета».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 27.09.2016 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 1,9336 | ▲ |
| Еўра | 2,1718 | ▲ |
| Рас. руб. | 0,0301 | ▼ |
| Укр. грыўня | 0,0747 | ▲ |

ISSN 1990 - 763X

# Жывыя карані Палесся



Фота БЕЛТА.

Удзельнікі творчага калектыву «Світанак» Дзятлавіцкага сельскага дома культуры з Лунінецкага раёна.

**Чым больш мы паважаем сябе, тым больш паважаюць і лічацца з намі. Менавіта пра гэта — фестываль этнакультурных традыцый «Кліч Палесся», які чацвёрты раз прайшоў у аграгарадку Ляскавічы, што ў Петрыкаўскім раёне Гомельшчыны. Яго поспех мае тры складнікі — унікальную некранутую прыроду, багатую гісторыка-культурную спадчыну, аўтэнтычныя народныя абрады і рамёствы. Фестываль арыентаваны на захаванне і папулярызацыю здабыткаў нацыянальнай культуры Беларусі. У чым жа прыцягальная сіла Палесся?**

СТАР. 4

■ Камунальныя стасункі

## БАТАРЭІ ЧАКАЮЦЬ ЦЯПЛА

### Мінжылкамунгас адзначае, што падрыхтоўка да ацяпляльнага сезона знаходзіцца на завяршальнай стадыі

**На вуліцы яшчэ не мінус нават уначы, але такая вільготнасць і вецер, што прабірае да дрыжыкаў. У кватэрах таксама неяк не камфортна, таму жыхары шматкватэрных дамоў з надзеяй пазіраюць на халодныя батарэі...**

«Хутка ўжо, хутка», — кажуць нам спецыялісты. Пашпарты гатоўнасці да новага ацяпляльнага сезона атрымалі каля 70% аб'ектаў усяго жыллёвага фонду краіны. Фактычна за гэты тыдзень і ўсё астатняе жыллё будзе цалкам падрыхтавана да зімы, паведаміў журналістам **прэс-сакратар Міністэрства жыллёва-камунальнай гаспадаркі Генадзь АКСЦІЛОВІЧ.**

### Пачакаем да кастрычніка?

Між іншым, асобныя рэгіёны могуць пускаць гарачую ваду ў батарэі хоць сёння. Так, аб сваёй суцэльнай падрыхтаванасці да зімы аб'явілі адпаведныя службы Гомеля, Гомельскай вобласці і Мінска, якія атрымалі пашпарты гатоўнасці два тыдні таму. «Трохі адстае Магілёўская вобласць. Але, як запэўніваюць кіраўнікі арганізацый па ўсёй сістэме ЖКГ, да 1 кастрычніка плануецца ўсе работы завяршыць цалкам», — адзначыў прэс-сакратар.

І яго ўпэўненасць мае пад сабой падставу. Цяпер рамонт і прафагляд сістэм ацяплення, а таксама цеплавых пунктаў жыллёвага фонду праведзены на 100%, рамонт стыкаў сценавых панэляў — на 99%, рамонт дахаў — на 97%.

СТАР. 2

■ Спажывец

## КІРМАШ ПА ЗАКОНАХ РЫНКУ

### Пра попыт і прапановы сезоннага гандлю

**Грандыёзныя ярка-аранжавыя, быццам казачныя гарбузы, глянцавыя сакавітыя яблыкі, духмяныя журавіны і, вядома, яна, каралева стала — адборная бульба. Прайсці міма такога харства амаль немагчыма. Мы і не будзем спрабаваць, а зазірнём (мажа, і набудзем што-небудзь) на сельскагаспадарчыя кірмашы ў Мінску, Магілёве і Гродне.**

Нядаўна Прэзідэнт, гаворачы аб далейшым развіцці аграпрамысловага комплексу, падкрэсліў, што беларускім аграрыям неабходна прадаставіць усе ўмовы для рэалізацыі прадукцыі, тым самым задавальняючы попыт насельніцтва. Рабіць гэта трэба без бюракратычных перашкод, арганізуючы кірмашы і базары. Як яны арганізуюцца ў самы сезон? Ці задаволеныя тыя, хто прадае, і тыя, хто купляе?




### Пакупнікам выгадна. А прадаўцам?

У сталіцы накіроўваемся на галоўны кірмаш Фрунзенскага раёна, які ўжо каторы раз размясціўся каля Лядовага палаца спорту. У нядзелю пасля абеду людзей не так ужо і шмат, рэдкія чэргі максімум па 2-3 чалавекі, здзіўляе і колькасць машын, з якіх прадаюць розныя тавары: іх менш за 30, у асноўным — легкавушкі. А вось прадукцыі выбар досыць вялікі: марынаваныя агуркі, свежыя і сушаныя грыбы, вэнджанае сала, лясныя ягады, і, вядома ж, гародніна і садавіна.

СТАР. 3

ЗВЯЗДА
Да чытача з любоўю!

**ПІШАМ ПРА ТОЕ, ШТО САПРАЎДЫ ВАЖНА**

**5 разоў на тыдзень!**

Заканчваецца падпіска на «Звязду» на IV квартал!

**ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ — БУДЗЕ ЦІКАВА!**

## Дзяржаўны візіт у Кітай

**Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка 28—30 верасня здзейсніць дзяржаўны візіт у Кітайскую Народную Рэспубліку, паведамілі ў прэс-службе беларускага лідара.**

Праграмай візіту запланаваныя перагаворы са Старшынёй КНР Сі Цзіньпінам. Па іх выніках чакаецца падпісанне каля 30 міжнародных дакументаў аб развіцці супрацоўніцтва ў палітычнай, эканамічнай і сацыяльнай сферах.

Аляксандр Лукашэнка ў Пекіне таксама правядзе сустрэчы з прэм'ерам Дзяржаўнага савета КНР Лі Кэцянам, старшынёй Усекітайскага камітэта Народнага палітычнага кансультатыўнага савета Кітая Юй Чжэншэнам і старшынёй Пастаяннага камітэта Усекітайскага сходу народных прадстаўнікоў Чжан Дэцзянам. Акрамя таго, Аляксандр Лукашэнка наведае Пекінскі ўніверсітэт, дзе сустрэнецца з кіраўніцтвам ВНУ, студэнтамі, адкажа на іх пытанні.

## Камфорт, хуткасць і якасць

### Прэзідэнт даручыў удасканаліць работу ў пунктах мытнага афармлення

**Такую задачу Аляксандр Лукашэнка паставіў па выніках сустрэчы са старшынёй Дзяржаўнага мытнага камітэта Юрыем Сянько.**

На сустрэчы было адзначана, што адна з задач мытнай службы — павышэнне транзітнай прывабнасці Беларусі. Памежныя і ўнутраныя пункты мытнага афармлення павінны працаваць бездакорна, каб увесь транзіт, які ідзе па тэрыторыі краіны, не адчуваў ніякіх цяжкасцяў з пункту гледжання камфорту, хуткасці і якасці абслугоўвання.

У цэнтры ўвагі Аляксандра Лукашэнкі таксама была праца беларускай мытні на расійскім напрамку. «Мяне цікавяць насцярожваючыя факты. Я хачу мець поўную інфармацыю пра паслугі, якія мы аказваем Расійскай Федэрацыі (бо Расія толькі дзякуючы нашай мытні абараняе свае інтарэсы на заходнім напрамку, і абапіраецца яна на мытныя органы Беларусі), каб я быў у курсе справы для размовы з кіраўніцтвам Расійскай Федэрацыі», — адзначыў кіраўнік дзяржавы.

Прэзідэнт цікавіўся, якім чынам строіцца работа мытных органаў у сувязі з эмбарга, якое Расія ўвяла ў дачыненні да шэрагу краін Заходняй Еўропы і іншых дзяржаў. У сувязі з гэтым старшыня Дзяржаўнага мытнага камітэта Юрый Сянько звярнуў увагу, што Беларусь дакладна выконвае свае функцыі, звязаныя з кантролем над перамяшчэннем санкцыйных тавараў, фактычна абараняючы расійскі бок ад незаконнага ўвозу грузаў.

Кіраўніку дзяржавы таксама далажылі аб выніках дзейнасці мытнай службы за мінулы перыяд бягучага года, прапановах ДМК па мінімізацыі штрафных санкцый у дачыненні да бізнес-структур, паведамляе прэс-служба Прэзідэнта. Як было адзначана, асноўныя паказчыкі работы мытных органаў выконваюцца. Аляксандр Лукашэнка мае намер дасканала прааналізаваць стан спраў у мытных органах Беларусі. «Мы ў пачатку наступнага года прааналізуем сітуацыю ў мытных органах па выніках гэтага года», — сказаў Прэзідэнт.

## Мікалай Корбут прызначаны памочнікам Прэзідэнта



Ён вызвалены ад пасады памочніка Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь — галоўнага інспектара па Мінскай вобласці, якую займаў да гэтага. Адпаведнае распараджэнне падпісаў кіраўнік дзяржавы Аляксандр Лукашэнка.

## Увага — ваенна-прамысловаму комплексу

**Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка правёў рабочую сустрэчу са старшынёй Дзяржаўнага ваенна-прамысловага камітэта Сяргеем Гурулёвым.**

Аляксандр Лукашэнка падрабязна цікавіўся станам спраў у ваенна-прамысловым комплексе краіны. Абмяркоўваліся як ужо рэалізуемыя праекты, так і перспектыўныя планы арганізацый і прадпрыемстваў, якія ўваходзяць у яго сістэму.

Асобная ўвага была ўдзелена эканамічнаму становішчу ваенна-прамысловага комплексу Беларусі.

Кіраўнік дзяржавы даў шэраг канкрэтных даручэнняў па пытаннях далейшага развіцця гэтай сферы.

# РАМАНТЫКА ЖАЛЕЗНЫХ КОНЕЙ

### У Мінску афіцыйна закрылі мотасезон-2016, удзел у свяце прыняў Прэзідэнт

**Міжнародны фестываль Harley-Davidson сабраў у нашай сталіцы сёлета больш за 3 тысячы байкераў, такога маштабу яшчэ не было. Акрамя ўдзельнікаў з нашай краіны на дарогі Мінска выехалі матацыклісты з Расіі, Эстоніі, Латвіі, Заходняй Еўропы і нават Новай Зеландыі (усяго прадстаўнікі 15 краін). Удзел у грандыёзным свяце прыняў і Аляксандр Лукашэнка.**



Фота БЕЛТА.

Фестываль пачаўся каля мемарыяльнага комплексу «Курган Славы». Туды кіраўнік дзяржавы разам з сынам Мікалаем прыехалі на матацыкле Harley Davidson. Прэзідэнт сустрэўся з афіцыйнымі асобамі галаўнога офіса Harley-Davidson і кіраўнікамі буйных аддзяленняў кампаніі з Еўропы і краін СНД. Затым на чале калоны матацыклістаў ён праехаў ад Кургана Славы да Палаца спорту, дзе наведаў аб'екты свята і паказальныя выступленні супрацоўнікаў спецпадраздзялення ДПС «Страла».

Наша краіна, ужо па традыцыі, падрыхтавалася да фестывалю як мае быць. Напрыклад, гасцям з далёкага замежжа былі адменены візы, на мяжы іх чакаў зялёны калідор, таксама арганізатары паклапаціліся і пра зручнае размяшчэнне байкераў у Мінску. У гатэлях ім прапанавалі зніжкі і турыстычныя праграмы. Адчуўшы такую гасціннасць, шматлікія ўдзельнікі якраз да заканчэння свята ўпэўнена заяўлялі, што абавязкова вернуцца ў Беларусь.

**Томі Нустрам — кіраўнік фінскай матасупольнасці «Harley-Davidson»** — байкер са стажам, аб'ехаў усю Еўропу і сёння адзначае, што Беларусь больш не белая пляма на яго, байкерскай, карце.

— *Наступным летам абавязкова сюды прыедзем, калі будзе цяплей, і прысвяцім Беларусі больш часу, каб падарожнічаць па ўсёй краіне. Фестываль тут выдатны, калі летась з Фінляндыі было ўсяго сямёра байкераў, то сёлета ўжо больш за дзесяць. Упэўнены, што ў будучыні гэтая колькасць будзе расці больш прагрэсіўнымі тэмпамі,* — адзначае Нустрам.

Перашкодзіць размаху свята не змаглі ні дождж, ні хмурнае неба, ні мокры асфальт. На шоу каля Палаца спорту сабралася не адна тысяча гледачоў, тут былі забавы на любы густ — 20 зон актыўнасці. Дзеці дэманстравалі ўменне вадзіць ровар і катацца на роліках, ну а лепшыя стантрайдэры Harley-Davidson паказвалі захапляльныя трукі на матацыклах.

Сумесныя выступленні падрыхтавалі беларуская і расійская інспектары ДАІ. Матацыклісты спецпадраздзялення ДПС «Страла» МУС і пілатажнай групы «Каскад», экіпажы сталічнай і абласной Дзяржаўтаінспекцыі прадэманстравалі контраварыйнае кіраванне, выкананне фігур вышэйшага пілатажу, кіраванне мота- і аўтатэхнікай у экстрэмальных умовах.

— *Гэта свята для многіх і я рады, што мяне таксама запрасілі на гэты мота-фэст. Такія зносіны дазваляюць тонка адчуць настрой удзельнікаў, іх менталітэт, ну і нейкія высновы для сябе рабіць адносна нашай сумеснай работы па бяспецы дарожнага руху,* — адзначыў **міністр унутраных спраў Ігар ШУНЕВІЧ.**

Завяршылася свята па традыцыі салютам і вялікім канцэртам, на якім выступілі Дзядзя Ваня, «Дразды», «Цягні-Талкай» і, вядома, Дзіяна Арбеніна з гуртом «Начныя снайперы».

Сусветная супольнасць Harley-Davidson — самая шматлікая ў свеце, яна налічвае больш за мільён удзельнікаў і штогод праводзіць буйныя фестывалі ў Францыі, Італіі, Аўстрыі, Германіі, Чэхіі. Байкерскі злёт — амаль як Алімпійскія гульні, займець яго прэстыжна і вельмі няпроста. Беларускі клуб Harley-Davidson пакуль не мае настолькі вялікіх маштабаў, але затое планы ў яго грандыёзныя: змагацца за магчымасць правесці агульнаеўрапейскі злёт «харлеяў» у Мінску да 115-годдзя легендарнага брэнда.

**Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.**

■ Форум

## ВЫСОКАЯ ТРЫБУНА ДЛЯ СУР'ЁЗНАЙ РАЗМОВЫ

**IV з'езд настаўнікаў і работнікаў адукацыі дзяржаў — удзельніц СНД пройдзе ў Маскве 3-4 кастрычніка. Галоўнай яго тэмай стануць інавацыі сучаснага адукацыйнага асяроддзя.**

Удзел у рабоце з'езда возьмуць больш як трыста дэлегатаў з Расіі, Арменіі, Беларусі, Казахстана, Кыргызстана, Малдовы, Таджыкістана і Туркменістана: кіраўнікі нацыянальных міністэрстваў адукацыі і навукі, работнікі адукацыі, эксперты міждзяржаўных і міжурадавых арганізацый СНД, адукацыйнай і навуковай супольнасці.

Удзельнікі з'езда разгледзяць шляхі абнаўлення і перспектывы развіцця дашкольнай адукацыі, пытанні мадэрнізацыі школьнай адукацыі і прымянення новых тэхналогій у навучанні, суправаджэнне адоранай моладзі, інавацыйнае навучанне, развіццё дадатковай адукацыі, інклюзіўнае навучанне, павышэнне міжнароднай акадэмічнай мабільнасці. У цэнтры ўвагі акажуцца выклікі сучаснай педагагічнай адукацыі, а таксама падрыхтоўка кадраў па найбольш запатрабаваных на рынку працы спецыяльнасцях.

У рамках з'езда адбудзецца выстава дасягненняў у сферы адукацыі дзяржаў — удзельніц СНД, на якой будуць прадстаўлены лепшыя адукацыйныя практыкі краін, у тым ліку інтэграцыйныя праекты па развіцці сумеснай адукацыйнай інфраструктуры.

**Для даведкі:** *I з'езд настаўнікаў і работнікаў адукацыі дзяржаў — удзельніц СНД адбыўся ў 2010 годзе ў Астане (Казахстан), II з'езд у 2012 годзе прымаў Ерэван (Арменія), а апошні з'езд праходзіў два гады таму ў Мінску.*

**Надзея НІКАЛАЕВА.** *nikalaeva@zviazda.by*

# БАТАРЭІ ЧАКАЮЦЬ ЦЯПЛА

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

**Начальнік аддзела энергетыкі і навукова-тэхнічнага развіцця Мінжылкамгаса Дзмітрый КАЗЛОЎ** паведаміў, што па стане на 1 верасня выкананы работы па выпрабаванні абсталявання 3 624 цеплавых пунктаў (99% ад плана), 15 326,6 кіламетра цеплавых сетак (99%), па прафілактычным рамонце абсталявання 3 571 кацельні (98%) і 1 801 цэнтральнага цеплавога пункта (100%), капітальным рамонце 41 катла (100%), ачыстцы ўнутраных паверхняў 2 015 катлоў (100%) і 1 006 бойлераў (100%).

Ён таксама адзначыў, што да 20 верасня неабходна было замяніць 448 кіламетраў цеплавых сетак, а па стане на 14 верасня заменена 442,3 кіламетра (99%), у тым ліку з выкарыстаннем папярэдне ізаляваных труб 433,3 кіламетра (98% ад замененых).

З палівам на зіму ў нас увогуле няма ніякіх праблем. Па стане на 14 верасня ў галіны створаны запас 13,5 тысячы тон топачнага мазуту (118% да задання), нарыхтавана 1 млн 566,7 тысячы кубічных метраў драўнянага паліва (88%), больш чым на 90% выкананы заданні па 11 з 15 паказчыках падрыхтоўкі да зімы водаправодна-каналізацыйнай гаспадаркі. Дзмітрый Казлоў паведаміў, што на 14 верасня атрыманы 2 721 пашпарт гатоўнасці цеплакрыніц, якія знаходзяцца на абслугоўванні ЖКГ, або 75% ад плана.

«Увогуле ход падрыхтоўкі аб'ектаў жыллёва-камунальнай гаспадаркі не адстае ад леташняга ўзроўню. Работы вядуцца ў планавым парадку, пашпарты гатоўнасці цеплакрыніц і спажыўцоў цеплавой энергіі будуць аформлены ў тэрмін — да 1 кастрычніка», — упэўнены прадстаўнік міністэрства.

## Не забудуць нікога

Генадзь Аксіловіч таксама папярэдзіў, што ацяпленне ў дамах уключаецца паэтапна, на працягу пяці дзён, і папрасіў жыхароў не тэлефанаваць у службы ЖКГ у першы дзень падключэння. «Спажыўцам няма патрэбы хвалявацца і турбаваць службы напамінам. Калі вас не падключылі ў першы дзень, то падключаць у другі ці трэці. Рэкамендуем грамадзянам устрымацца ад вала званкоў у службы эксплуатацыі, каб не перашкаджаць планамернай рабоце па падключэнні жыллёвага фонду да цеплавых крыніц», — сказаў ён.

## Плюс цеплавая рэабілітацыя

**Намеснік генеральнага дырэктара па эксплуатацыі жыллёвага фонду і вытворчых пытаннях Мінскай гарадской жыллёвай гаспадаркі (МГЖК) Юрый КУКАШУК** адзначыў, што падрыхтоўка да ацяпляльнага сезона 2016/2017 гадоў у сталіцы пачынаецца вясной з агляду жылфонду жыллёвымі арганізацыямі, падчас якога ўдакладняюцца аб'ёмы будучых работ. Таму ў сталіцы халады і не прыйшлі знянацку.

Паводле слоў намесніка гендырэктара МГЖК, сёлета ў Мінску выкананы рамонт 213 тысяч квадратных метраў дахаў, 154 тысяч метраў стыкаў сценавых панэляў, праведзена гідраправанне 1,6 тысячы ўнутраных сістэм ацяплення ў 6 893 жылых дамах і рамонт 229 воданагравальнікаў, а таксама заменена 329 кубічных метраў цеплавой ізаляцыі. Акрамя таго, пры падрыхтоўцы да эксплуатацыі ў асенне-зімовы перыяд у сталіцы была выканана цеплавая рэабілітацыя на 116 тысячах квадратных метраў фасадаў жылых будынкаў.

**У тэму**

***У камунальных службаў ёсць тэмпературныя нормы, паводле якіх і адбываецца ўключэнне або выключэнне ацяплення ў гарадскіх кватэрах. Калі 5 дзён запар сярэднесутачная тэмпература на вуліцы будзе ніжэйшая за 10 градусаў, то будзе ўключана ацяпленне ў адукацыйных і медыцынскіх установах. Для таго каб пачалі ацяпляць жылую нерухомасць, неабходная сярэднесутачная тэмпература не вышэйшая за 8 градусаў.***

***Дарэчы, мінскія спецыялісты ЖКГ запэўнілі карэспандэнта «Звязды», што ў выпадку рэзкага пахаладання і замаразкаў камунальныя службы не маюць намеру чакаць запланаваныя 5 дзён, а пачнуць неадкладна ацяпляць сталічнае жыллё. І няма падстаў ім не верыць.***

**Сяргей КУРКАЧ.** *kurkach@zviazda.by*

# КІРМАШ ПА ЗАКОНАХ РЫНКУ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Ігар з легкавой машыны гандлюе бульбай, морквай і яблыкамі. Такім чынам ён зарабляе ўжо не першы год: родам з Брэсцкай вобласці, у Мінску хлопец вучыцца ва ўніверсітэце.

— Для маштабнага продажу бульбы яшчэ занадта рана, звычайна людзі закупляюцца на зіму ў канцы кастрычніка. А вось морква ідзе выдатна. І цана зусім невялікая — 45 капеек за кілаграм.

А вось бульба не такая ўжо танная — 30 капеек за кілаграм, хоць на суседстве можна знайсці і за 27, і нават за 25 капеек.

— Вы пагля дзіце на маю. Адборная, буйная, чысценькая! — крыўдзіцца прадавец. — Людзі бяруць на пробу па некалькі кілаграмаў, а потым вяртаюцца і ўжо заказваюць мяшкамі. У мяне няма задачы «абы збыць», таму цану пакуль паніжаць не буду. Усё, што не атрымаецца прадаць цяпер, вясной здадзім дзяржаве, звычайна гэта тон 30. Вялікі аб'ём, таму і сума можа не такая ўжо і малая выйсці.

Сельскай гаспадаркай родныя Ігара займаюцца ўсёй сям'ёй. Пры гэтым у бацькоў ёсць яшчэ і асноўная праца, так што фермерамі яны не лічацца.

— Вы разумееце, справа ж зусім не ў заробку. Ніякіх шалёных сум няма. Проста людзі прывыклі так жыць. У нас у вёсцы кожная другая сям'я вырошчвае гародніну на продаж. Сорамна кінуць, адразу замацуецца вобраз — гультаі. Вунь насупраць стаіць мой стрыечны брат, таксама гандляваць прыехаў.

А вось побач з Ігарам уладкаваўся дзед Казімір. Ён з гонарам расказвае, што прыехаў з-пад Століна. У асартыменце — яблыкі па 80 капеек і агуркі па паўтара рубля. Прыехаў на выхадныя, да гэтага гандляваў на Заходнім рынку, на кірмаш перабраўся, каб збыць рэшткі тавару: не везці ж іх назад!

— Заробку хопіць хіба што адбіць дарогу. За месца на рынку — заплаці, за экспертызу якасці — заплаці, і гэтыя сумы вылічваюцца не капейкамі! Добра хоць тут за месца плаціць не трэба: зарэгістраваўся і гандлюй на здароўе. У Мінск еду, таму што ў нас на Палессі ў кожнага свая гаспадарка, тавару гэтага — завалася, цэны мізэрныя. Хоць гэты год у цэлым адрозніваецца нізкімі цэнамі на сваю агародніну і садавіну. Для пакупніка гэта, вядома, радасць, а вось для нас — вялікі смутак. Нарыхтоўшчыкі ў нас прымаюць мала: калі ў кожнага сабраць, колькі яны гатовыя здаць, то незразумела, што з такімі велізарнымі аб'ёмамі рабіць! Ды яшчэ і перакупшчыкі ціснуць, дзе ўжо дробнаму прыватніку з імі цягацца.

Дзед Казімір махае рукой, уручае рэшткі агуркоў Ігару, маўляў, у інтэрнаце спатрэбяцца, і пачынае збіраць рэчы. Тым часам да маладога чалавека падыходзяць хлопец з дзяўчынай і просяць узважыць кілаграм бульбы.

Па прызнанні Яны і Дзімы, на кірмаш яны прыйшлі па натуральнасць. Аднак ідэю — закупляць прадукты на зіму — не падтрымліваюць: «Мы заўсёды бяром толькі тое, што трэба цяпер. Не хочацца перапрацоўваць невялікую кватэру ў склеп. Стараемся гатаваць складаныя, цікавыя стравы. А закупіць 5 мяхоў бульбы і есці яе зімой кожны дзень, прабачце, гэта, як нам здаецца, зусім не здарова! Сёння ў нас на вячэру мяса ў ягадным соусе, таму купілі журавіны і свежыя грыбы. На гарнір, але гэта рэдкае выключэнне, — пюрэ з бульбы. Засталося толькі купіць гародніну для лёгкай салаты». А вось Пётр Іванавіч з пазіцыяй маладой пары зусім не згодны: да зімы, лічыць ён, трэба рыхтавацца загадзя. Ён шукае менавіта тыя самыя, але не 5, а 6 мяхоў лепшай бульбы.

## Вам «Брызу» або «Журавінкі»?

У гэтыя выхадныя народ купляў вітаміны ў цэнтры Магілёва непадалёк ад сквера 40-годдзя Перамогі па вуліцы Міронава. Плодаагароднінную прадукцыю гэтага ўраджаю прапаноўвалі больш за 35 суб'ектаў гаспадарання, удакладніла начальнік упраўлення гандлю і паслуг гарвыканкама Таццяна Будкевіч. З 10 раніцы да 16 гадзін вечара гараджане маглі купіць рыбу, садавіну, гародніну, саджанцы, насенне раслін і траў, сельскагаспадарчы інвентар. А яшчэ падсілкавацца кулінарнымі і кандытарскімі вырабамі, набыць сокі, гарачы чай, каву і шмат чаго іншага.



Ажыятажу пакуль няма, цікавасць праяўляюць больш пенсіянеры. Але хапае і маладых сем'яў з дзіцячымі калясKамі. Народ пацiху прыглядаецца да цэн і асартыменту. Сужэнцы Раіса і Эдуард Грамыкі ўзялі на пробу некалькі кілаграмаў бульбы «Брыз» па 30 капеек за кіло. «Учора былі на Грабянёўскім рынку, там гэты сорт прадаваўся танней — па 25 капеек», — заўважае жанчына. «І лецішча сваё ёсць, але ўсё, што там расло, разам з дзецьмі ўжо з'елі», — усміхаецца яна. У планах купіць у запас салодкага перцу, капусты, бульбы. Спяшацца пенсіянеры пакуль не збіраюцца, напярэдадні яшчэ шмат кірмашоў. Але карысныя тэлефонамі ўжо пачалі запасацца. Канкурэнцыя такая, што прадаўцы гатовыя свой тавар на дом да спажыўца везці.

— А я ўзяла сабе мяшок бульбы, яна тут таннейшая, чым на рынку, — жанчына расчытвае на наведвальнікаў ад начасова расказвае пра «спекулянтаў», што гандлююць на стыхійных рынках. — Некаторыя прадаюць вёдрамі — па 40 капеек за кіло. А тут па 25—30 капеек. Таму я чакаю кірмашоў, каб купіць бульбу, капусту і цыбулю на зіму.

Попыт на гародніну-садавіну аграгаспадаркі «Вейна» стабільны. Цэны вельмі прывабныя для пакупніка. Кіло бульбы 29 капеек, капусты — 38 капеек, кабачкоў — 18 капеек, таматаў — адзін рубель 35 капеек. Але такі кошт не дазваляе фірме ўтрымліваць сетку крам, як гэта было раней. На ўвесь Магілёў засталася адна. Фірма амаль цалкам перайшла на выязны гандаль. «І кірмашы вельмі дапамагаюць аператыўна прадаць сабраны ўраджай. Бо тут купляюць не кілаграм-два, а мяшкамі», — запэўнівае прадавец.

На вочы трапляюць цэтлікі на беларускай мове. Люся Пятроўна Кустоўская з задавальненнем прызнаецца, што яна патрыётка і аддае перавагу выключна беларускім сартам. Тая ж цыбуля ў яе не растоўская, як у іншых, а айчынная. Вырошчваннем вітамінаў яна не займаецца, бярэ толькі пад рэалізацыю. Да справы падыходзіць крэатыўна, а таму народ не абыходзіць яе бокам. Бізнесам, дарэчы, занялася пасля таго, як трапіла ў рэстаране пад скарачэнне. Набыла мікрааўтобус і пачала прадаваць. Каля яе кропкі і сапраўды шматлюдна. Чаго не скажаш пра яе суседа з вялікім фургонам бульбы. Сядзіць сабе моўчкі, нага за нагу. «У яго добра атрымліваецца вырошчваць, а прадаваць зусім не ўмее», — па-змоўніцку шэпча прадавачка.

Прадпрымальнік Сяргей Шлапакоў з Вялікага Межніка бойка прапаноўвае гародніну. Уздыхае, што сёння прасцей вырасціць, чым прадаць. Кірмашы вельмі добра дапамагаюць рэалізаваць большую частку ўраджаю. Кіло бульбы ў Сяргея 25 капеек, памідораў — 85, морквы — 31 капейка, перцаў — адзін рубель 15 капеек.

Вытворцы і спажыўцы салідарныя ў тым, што восеньскія кірмашы павінны праводзіцца паўсюдна — не толькі ў абласных, але і ў раённых цэнтрах, а яшчэ ў спальных раёнах, дзе шматпавярховая забудова. Там попыт на «Брыз» ці «Журавінку» яшчэ вышэйшы.

## На любы густ

Асноўная колькасць кірмашоў у Гродне запланавана на кастрычнік, прадоўжацца яны і ў лістападзе. Увогуле, згодна з інфармацыяй упраўлення гандлю і паслуг Гродзенскага аблвыканкама, у абласным, раённых цэнтрах і шэрагу іншых населеных пунктаў пройдзе каля 80 восеньскіх кірмашоў.

У тым, што дарогу восені сапраўды ўдосталь і ўсе ахвочыя будуць імі забяспечаны, аўтар гэтых радкоў пераканалася ў гэтую нядзелю на Цэнтральным рынку ў Гродне. Прычым і сам не толькі кінуў вока на прадстаўленую там прадукцыю, але і нечым атавараўся — у прыватнасці, рыбай. Па словах работнікаў рыбгаса «Струбніцкі» з Мастоўскага раёна, штогод яны атрымліваюць каля 15 тон рыбы, а гандляваць ёй будуць да снежня. Паколькі я гэтай раніцай быў у іх ужо зусім не першым пакупніком, то, мусіць, скурка варта вычынкі. Дарэчы, побач гандлявалі і рыбгасы са Шчучынскага раёна, з Брэстчыны. На спецыялізаваных рыбных кірмашах, якія запланаваны ў абласным цэнтры на 8 і 15 кастрычніка, прапанова прадукцыі, вядома ж, будзе яшчэ большай.

Што ж тычыцца прылаўкаў з агароднінай, то і тут выбар на любы густ — бульба, памідоры, капуста, перац, морква, цыбуля, часнок... Хочаш — купляй на тыдзень-два, а хочаш — атаварвайся надоўга.

— У мяне ёсць на гэтым рынку прадавец, у якога я купляю агародніну ўжо не першы год, — кажа пенсіянерка Валянціна Тарасевіч. — Не сумняваюся, што якасць прадукцыі выдатная, ды і цэны нармальныя.

Дарэчы, машыны з бульбай цяпер чакаюць пакупнікоў літаральна каля кожнага міні-рынка, прычым з магчымасцю яе дастаўкі пакупнікам. Калі ж у іх няма ўмоў для захоўвання значнага аб'ёму прадукцыі, то лепш, канешне, купляць у невялікай колькасці, напрыклад, у фірменных крамах сельгаспрадпрыемстваў. Дэфіцыту там, як можна пераканацца на прыкладзе крамы СВК імя В.І. Крамко Гродзенскага раёна, таксама ніколі не бывае.

**Дар'я КАСКО.** *kasko@zviazda.by*
**Нэлі ЗІГУЛЯ.** *zigulya@zviazda.by*
**Барыс ПРАКОПЧЫК.** *prakopchik@zviazda.by*

# Свята ўраджаю і рыцарскія забавы

**Да абласных «Дажынак»**

## Мсціслаў амаль цалкам змяніў свой твар

**Гулянне ў Мсціславе стала двайным, бо свята сярэднявечнай культуры — рыцарскі фэст, які традыцыйна праводзіцца тут летам, сёлета спецыяльна прымеркавалі да ўрачыстага дня падвядзення вынікаў уборачнай кампаніі.**

## Дом, дзе злучаюцца лёсы

Горад не толькі атрымаў гістарычны глянец, але і стаў больш камфортным для жыцця. У суботу ў Мсціславе адкрылі прасторны Палац шлюбу і ўрачыстасцяў, які адразу стаў запатрабаваны. Дзве пары злучылі тут свой лёс у прысутнасці кіраўніцтва вобласці і горада і атрымалі ад апошніх сертыфікаты на 2,5 тысячы «новых» рублёў.

На самой плошчы паявілася паўавальная каланада з датай заснавання Мсціслава — 1135 год.

— Падрыхтоўка да свята ішла напружана, паколькі мы імкнуліся захаваць старадаўнае аблічча і традыцыі горада, — адзначыў **старшыня Магілёўскага аблсавета дэпутатаў Анатоль ІСАЧАНКА.** — Падтрымка жыхароў райцэнтра і арганізацый была адчувальнай: на абнаўленне горада пайшло каля 180 мільярдаў недэнамінаваных рублёў.

## Новыя назвы

Мсціслаў вядомы сваімі выдатнымі людзьмі. Яго цэнтр упрыгожвае помнік знакамітага на ўвесь свет першадрукара Пятра Мсціслаўца — ураджэнца гэтага горада. Цяпер і плошча перад райвыканкамам атрымала імя славутага выдаўца. І гэта не адзінае перайменаванне ў сувязі з «Дажынкамі».

— Мсціслаў, на жаль, не захаваў старых назваў, таму перайменаванні рабіліся па сэнсе, — кажа **старшы навуковы супрацоўнік раённага гісторыка-археалагічнага музея Валянцін ЦІМАШКОВА.** — Вось, напрыклад, гандлёвыя рады — помнік архітэктуры пачатку XX стагоддзя. Вуліцу назвалі — Пірагоўская. Перайменаваць вырашылі на той падставе, што тут пяклі пірагі і пах разносіўся на ўсё наваколле. Яшчэ адна вуліца, дзе знаходзіцца кармеліцкі касцёл, атрымала назву Кармеліцкая.

## Воўк, вежа і падарожжа ў часе

Пасля двух апошніх пленэраў на вуліцах стала больш драўляных і каменных скульптур. Бронзавая жывёла на камені збоку ад райвыканкама — воўк, выява якога маецца на бела-блакітным сцягу Мсціслава. Носік скульптуры ўжо блішчыць. Легенда, што, калі яго пацерці, да цябе павернецца шчасце, працуе. На гэтай жа вуліцы можна ўбачыць каменнае ўвасабленне ракі Віхры. Скульптар Аляксандр Мінькоў увявіў яе ў вобразе жанчыны, якая купаецца.

Ёсць у Мсціслава цяпер і свая аглядная вежа — 25-метровая пажарная каланча, помнік архітэктуры пачатку XX стагоддзя. Менавіта тут у 1890 годзе было створана адно з першых у Магілёўскай вобласці добраахвотнае пажарнае таварыства.

Замкавая гара таксама змянілася да непазнавальнасці. За апошнія некалькі гадоў археалагічных даследаванняў тут былі зроблены тысячы ўнікальных знаходак. Цяпер гістарычнае месца ўпрыгожваюць драўляныя пабудовы ў стылі XII стагоддзя, праз адну з якіх можна трапіць на восем вякоў назад. Гэта закансерваваны кавалачак былой вуліцы, які ажыў дзякуючы магілёўскім археолагам на чале з доктарам гістарычных навук, прафесарам Ігарам Марзалюком. Тут бып прымене ны новы спосаб музеефікацыі.

— Гэты комплекс унікальны для Усходняй Еўропы. Аналагаў яму ў свеце будзе няшмат, — падкрэсліў падчас адкрыцця комплексу **намеснік старшыні Магілёўскага аблвыканкама Валерый МАЛАШКА.**

## Героям жніва прысвячаецца



Фота БЕЛТА.

Зразумела, што за такі кароткі час горад раённага падпарадкавання, нават такі знакаміты, як Мсціслаў, нельга было б аднавіць, калі б не свята хлебаробаў. Гэта добры прыклад сумесных намаганняў. Уклад хлебаробаў Магілёўшчыны ў агульнарэспубліканскі каравай — больш за мільён тон збожжа. Планкі 5 тысяч тон па намалоце збожжа дасягнулі толькі 4 экіпажы ў краіне. І два з іх — прадстаўнікі Магілёўскай вобласці. Гэта Віктар Якуцін і Кірыл Воўкаў з гаспадаркі «Александрыйскае» Шклоўскага раёна і два Уладзіміры — бацька і сын Корсакі з агракамбіната «Зара» Магілёўскага раёна.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.** *zigulya@zviazda.by*

■ Надвор'е

# ЦЯПЛО ЯШЧЭ ВЕРНЕЦЦА

Сіноптыкі прагназуюць, што першая хваля маладога бабінага лета завітае да нас ужо на выхадныя

**Пацяпленне мы чакаем напрыканцы тыдня, а пакуль на тэрыторыі Беларусі будзе анамальна халаднавата, паведаміў начальнік службы гідраметэаралагічных прагнозаў Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды Дзмітрый РАБАЎ.**

Так, у першыя дні тыдня надвор'ем будзе гаспадарыць зона павышанага атмасфернага ціску, што сфарміравана ў халодным паветры поўначы Еўропы. У аўторак ападкаў не чакаецца. Максімальная тэмпература паветра складзе ад плюс 10 да плюс 16 градусаў. А вось у сераду месцамі пройдуць кароткачасовыя дажджы. Уначы і раніцай у асобных раёнах чакаецца туман. Тэмпература паветра ўначы складзе ад 2 да 9 цяпла, удзень — плюс 10—16 градусаў, а па паўднёвым захадзе — да 18 цяпла. У чацвер да нас завітае атмасферны фронт з боку Заходняй Еўропы, які прынясе на большую частку тэрыторыі краіны кароткачасовыя дажджы. Тэмпература паветра ўначы будзе ад 4 да 11 цяпла, удзень — ад плюс 11 да плюс 17 градусаў, па паўднёвым захадзе — да 19 цяпла.

Залатая і камфортная восень пачне гаспадарыць у нас з пятніцы, калі з ростам атмасфернага ціску дажджоў стане менш, а ў краіну накіруюцца больш цёплыя паветраныя масы з боку паўднёвага захаду Еўропы. Надвор'е адразу палепшыцца. З пятніцы па нядзелю ўключна месцамі пройдуць кароткачасовыя дажджы. Пацяплее нават уначы, калі тэмпература паветра будзе дасягаць плюс 6—13 градусаў, удзень — ад плюс 14 да плюс 20 градусаў, а па поўдні — 21—23 цяпла.

**Сяргей КУРКАЧ.** *kurkach@zviazda.by*

# ЗАБОЙСТВА НА ЎСКРАІНЕ БЕРАЗІНО

**Упраўленнем Следчага камітэта па Мінскай вобласці распачата крымінальная справа аб забойстве мужчыны, труп якога знойдзены ў згарэлым аўтамабілі. Адбылося гэта раніцай у панядзелак на ўскраіне Беразіно падчас тушэння палаючага прыпаркаванага легкавіка.**

Устаноўлена асоба загінуўшага. Ім быў уладальнік згарэлай машыны, жыхар Беразіно 1973 года нараджэння. Следча-аператыўнай групай праводзіцца шэраг аглядаў, у тым ліку аўтамабіля, прылеглай тэрыторыі, месца пражывання мужчыны. Плануецца працэдура апазнавання цела. Следствам правяраюцца розныя версіі таго, што здарылася. Работа па ўстанаўленні прычын і абставін гібелі мужчыны, узгаранне аўтамабіля працягваецца. Прызначаныя судовыя экспертызы.

**Сяргей РАСОЛЬКА.** *rs@zviazda.by*

# Жывыя карані Палесся



Артысты акадэмічнага ансамбля песні і танца «Сіверскія клейноды» рыхтуюцца да выхаду на сцэну.

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Творчыя калектывы палескіх раёнаў краіны на сваіх падворках імкнуліся прадставіць фрагменты старадаўніх свят і абрадаў. Калінкавіцкі падворак, напрыклад, меў назву «Багач». **Дырэктар Юравіцкага цэнтра народнай творчасці Анжэла ПАТАШКА** ўспамінае, што ў іх мясцовасці была традыцыя штомесяц 25 чысла прадаваць лішкі сельскагаспадарчай прадукцыі на кірмашы ў Юравічах:

— Туды ўсё наваколле з'язджалася. Вось і мы прадстаўляем тое, чым багаты. Глядзіце, які ў нас прыгожы і смачны ўраджай садавіны і агародніны!

Восем умоўных вуліц склалі адну палескую вёску. Усе назвы знаёмыя, і, здаецца, менавіта так яно і было калісь: з Багатай трапляў на Пакроўскую, з Кірмашовай — на Вясельную... Каб тут, за ткацкім станком, сустрэцца з... жыхарамі Германіі Брыгітай і Томасам Рымаль. Яны вучацца ў Людмілы Бычук з пінскай мастацкай фабрыкі «Крыніца Палесся» беларускі ручнік ткаць. Кажуць: прыехалі да сяброў у Мазыр. Яны і паклікалі на гэтае свята:

— Вельмі цікава пабачыць старажытныя беларускія рамёствы. Якое ў вас прыгожае народнае адзенне! А яшчэ шмат усяго смачнага.

Дзе яшчэ пакаштуеш марынаваных гуркоў з мёдам? Канешне, на падворку палешукоў, якія прыехалі з Лунінецкага раёна. Дырэктар Дзятлавіцкага сельскага дома культуры Алена Яскевіч разам з калектывам аднадумцаў можа здзівіць і стравамі, і песняй прыгожай. Да таго ж усе ўдзельнікі творчага калектыву «Світанак» добра ведаюць і любяць нашу газету. Некаторым, як Галіне Хартановіч, пашанцавала нават выйграць прыз ад «Звязды».

Між тым каля галоўнай сцэны да выступленняў рыхтаваліся госці. Сваім незвычайным строем увагу прыцягваў **Хізры АСАДУЛАЕЎ**. Ён — **заслужаны мастак Дагестана**, а яшчэ **кіраўнік міжнароднага грамадскага аб'яднання «Гаро»**:

— Мы ўзбагачаем каларыт гэтага грандыёзнага мерапрыемства. Тут прадстаўляем рэспубліканскі цэнтр нацыянальных культур Беларусі. Кожны павінен памятаць пра свае вытокі. Калі мы іх страцім, што ад нас у будучыні можна чакаць? Мы ёсць настолькі, наколькі памятаем свае карані, традыцыі, звычаі і мову.

З Латвіі на Палессе завітаў народны ансамбль «Сватра». Артысты ў Беларусі ўпершыню. Фальклор для іх — практычна лад жыцця і яшчэ адна магчымасць заявіць пра сябе на мове музыкі, гаворыць **кіраўнік фальклорнай групы Сарматэ ТЭЙВАНЕ**:

— Нас вельмі зацікавіла тое, што гэта фестываль этнакультуры. Мы жадаем убачыць іншыя традыцыі, паглядзець на іншую культуру, а таксама ўсім паказаць, што такое наш латвійскі рэгіён Латгалія.



Акадэмічны ансамбль песні і танца «Сіверскія клейноды» віdaвочна ўсіх захапляе яскравым выступленнем. Здаецца, юнакі ў шараварах ды з «асяледцамі» лятаюць над сцэнай. А дзяўчаты ў стужках заварожваюць вытанчанасцю і шчырымі ўсмешкамі. Дарэчы, з беларускага Палесся да ўкраінскага — рукой падаць. І таму чарнігаўскі калектыў тут не ўпершыню.

На канцэрце была прадстаўлена не толькі ўнікальная традыцыйная музычная культура Палесся, але і адметныя фестывальныя брэнды Гомельскага рэгіёна — харэаграфічны «Сожскі карагод», фестывалі фальклорнага мастацтва «Берагіня», народнага гумару «Аўцюкі».

На святе ганаровыя дыпломы і сімвалічныя статуэткі разам са званнем «Ганаровы паляшук» атрымалі народны артыст Беларусі, мастацкі кіраўнік Нацыянальнага акадэмічнага хору імя Цітовіча Міхаіл Дрынеўскі, старшыня СПК «Фядорскі» Столінскага раёна Рыгор Дзямко і былы генеральны дырэктар Мазырскага НПЗ Анатоль Купрыянаў. Менавіта пры фінансавай падтрымцы магутнага беларускага прадпрыемства стаў магчымым збор палешукоў у Ляскавічах.

Услед за колькасцю ўдзельнікаў этнафоруму (а сёлета іх каля 300), расце і турыстычная прывабнасць Палесся. Пра ўнікальны прыродны рэгіён ужо даведаліся далёка за межамі краіны. Гэты край і сёння цікавіць этнографаў і культуролагаў. Міжнародны фестываль «Кліч Палесся» ярка дэманструе самабытнасць беларускай культуры, адзначае **міністр культуры Барыс СВЯТЛОЎ**:

— Каб зразумець, чым мы, беларусы, адрозніваемся ад астатніх краін, нам патрэбныя менавіта такія святы культурна-этнаграфічнай скіраванасці. Нягледзячы на наяўныя тэндэнцыі ніveліравання культурнай прасторы пад так званую ўсходнюю ці заходнюю культуру, зварот да сваіх вытокаў непазбежны.

— Самая вялікая аддача гэтага свята — захаванне традыцый нашых беларускіх, палескіх, і, вядома, самае галоўнае — гэта тое, што людзі імкнуцца да сваіх каранёў, — заўважае **дырэктар Нацыянальнага парка «Прыпяцкі» Сцяпан БАМБІЗА**.

На святе ўпершыню праведзены конкурс юных майстроў «Перазвон талентаў» з удзелам дзяцей, якія дэманстравалі розныя віды рамёстваў.

Фестывальныя мерапрыемствы ў Ляскавічах працягваліся да глыбокай ночы. Тыя, хто дачакаўся фіналу, былі ўзнагароджаны не толькі салютам, але і знаёмствам з самымі прыгожымі палескімі дзяўчатамі. Яны дэманстравалі мастацтва дэфіле ў нацыянальных строях, вясельных сукенках, эксклюзіўных дызайнерскіх уборах і ў раскошных футрах айчынных вытворцаў. Ну а пераможцай конкурсу прыгажосці «Палеская прыгажуня — 2016» стала Ала Мяшкова з Петрыкава.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**
*iost@zviazda.by*



Юравіцкі цэнтр народнай творчасці прадстаўляе яго дырэктар Анжэла ПАТАШКА з калегамі.

Минский городской центр недвижимости

## Коммунальное унитарное предприятие «МИНСКИЙ ГОРОДСКОЙ ЦЕНТР НЕДВИЖИМОСТИ» 12 октября 2016 г. проводит повторный открытый аукцион с условиями № 11-У-16 на право проектирования и строительства капитальных строений (зданий, сооружений)

**Вид аукциона:** открытый (на повышение начальной цены).
**Предмет аукциона:** право проектирования и строительства капитальных строений (зданий, сооружений) на предоставляемом земельном участке, на котором находятся объекты, подлежащие сносу.
Аукцион проводится в порядке, установленном постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26.03.2008 г. № 462.
На торги выставляется право проектирования и строительства капитальных строений (зданий, сооружений) на четырех земельных участках в г. Минске, предоставляемых в аренду сроком на 5 лет:

| № предмета аукциона | Месторасположение земельного участка | Площадь земельного участка, га | Целевое назначение земельного участка | Начальная цена предмета аукциона, рублей образца 2009 года/ рублей образца 2000 года | Сумма задатка | Расходы на подготовку документации для проведения аукциона, рублей образца 2009 года/ рублей образца 2000 года | Наличие обременений | Ориентировочный размер убытков, причиняемых изъятием земельного участка и сносом расположенных на нем объектов недвижимости, рублей образца 2009 года/ рублей образца 2000 года |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 |
| 1 | г. Минск, просп. Дзержинского – ул. Уманской | 0,48 | для строительства объекта «Объект общественного питания быстрого обслуживания с линией автораздачи по просп. Дзержинского – ул. Уманской» | 217 548,21/ 2 175 482 100 | 33 000/ 330 000 000 | 10 046,09/ 100 460 900 | Отселение и снос жилых и нежилых строений по просп. Дзержинского, 59 | 552 296,64/ 5 522 966 400 |
| 2 | г. Минск, ул. Машиностроителей – МКАД (9 км) | 1,4228 | для строительства объекта «Многофункциональный комплекс с паркингом по ул. Машиностроителей – МКАД (9 км)» (состав объекта: торговый комплекс – 5000 кв.м, административный – 5000 кв.м, встроенный паркинг, производство – 10 000 кв.м) | 408 491,96/ 4 084 919 607 | 60 000/ 600 000 000 | 11 684,03/ 116 840 302 | Снос зданий и сооружений по просп. Партизанскому, 160А. Демонтаж внутриплощадочного водопровода диаметром 100 мм, частичный демонтаж сетей ливневой канализации | 200 810,24/ 2 008 102 425 |
| 3 | г. Минск, в районе ул. Ваупшасова – МКАД (4 км) | 1,6426 | для строительства объекта «Объект придорожного сервиса (гостиница, кафе, торговля) в районе ул. Ваупшасова – МКАД (4 км)» | 575 101,85/ 5 751 018 480 | 80 000/ 800 000 000 | 11 743,94/ 117 439 441 | Снос зданий и сооружений по ул. Карвата, 100 | 1 166 718,16/ 11 667 181 620 |
| 4 | г. Минск, ул. Волгоградская | 0,6583 | для строительства объекта «Многоквартирный жилой дом по ул. Волгоградской» (повышенной комфортности) | 272 950,96/ 2 729 509 600 | 41 000/ 410 000 000 | 19 196,92/ 191 969 200 | отселение и снос в установленном порядке жилых и нежилых строений по ул. Волгоградской, д. 82, 84; по ул. Новгородской, 3, 5. Демонтаж распределительных инженерных сетей | 5 729 430 57 294 300 000 |

Основные требования по проектированию и строительству объекта и условия предоставления земельного участка указаны в земельно-кадастровой и иной документации, подготовленной для проведения аукциона.

Сведения о наличии инженерных коммуникаций на указанных земельных участках и их характеристики содержатся на планово-картографических материалах в составе земельно-кадастровой документации.

Инженерное развитие инфраструктуры застраиваемой территории участков осуществляется в соответствии с техническими условиями на инженерно-техническое обеспечение соответствующего объекта, выданными эксплуатирующими и согласующими организациями (согласно перечню, установленному Минским горисполкомом).

**Аукцион состоится 12 октября 2016 года в 16.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов.**

Участниками аукциона могут быть юридические лица или индивидуальные предприниматели. В аукционе допускается участие на стороне покупателя консолидированных участников – двух и более индивидуальных предпринимателей, юридических лиц.

**Для участия в аукционе необходимо:**

**внести задаток не позднее 6 октября 2016 г.** в размере, указанном в графе 6 таблицы, перечисляемый на расчетный счет № 3641000000016 в ОАО «АСБ Беларусбанк», код банка – 795, УНП – 100690830, назначение платежа – 04002, получатель – главное финансовое управление Мингорисполкома;

**представить в коммунальное унитарное предприятие «Минский городской центр недвижимости» (организатору аукциона) следующие документы:**

заявление на участие в аукционе;

документ, подтверждающий внесение суммы задатка, с отметкой банка;

подписанное соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (в двух экземплярах) установленной формы, включающее обязательство по уплате в соответствии с законодательством штрафных санкций и иные требования;

**дополнительно представляется:**

индивидуальным предпринимателем – копия свидетельства о государственной регистрации индивидуального предпринимателя без нотариального засвидетельствования;

представителем индивидуального предпринимателя – нотариально удостоверенная доверенность;

представителем или уполномоченным должностным лицом юридического лица Республики Беларусь – доверенность, выданная юридическим лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии устава и свидетельства о государственной регистрации юридического лица без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юридического лица;

Яшчэ адным фактарам на карысць павышэння цэн на вугаль сталі трывожныя паведамленні сіноптыкаў. Загадкавая кліматычная з'ява Ла-Нінья (характарызуецца анамальным паніжэннем тэмпературы паверхні вады ў цэнтральнай і ўсходняй частках трапічнай зоны Ціхага акіяна) пагражае прынесці ў Аўстралію, Інданезію і Паўднёвую Афрыку моцныя працяглыя дажджы. Як вядома, у 2010—2011 гадах падтапленне вугальных шахтаў у адных з найбуйнейшых пастаўшчыкоў вугалю для Кітая — Аўстраліі і Інданезіі — прывяло да зніжэння вытворчасці і росту цэн. Напрыклад, у 2011 годзе кокс прадавалі за $335 за тону па «FOB Аўстралія».



Асобныя аналітыкі сцвярджаюць, што Ла-Нінья можа працягвацца да двух гадоў. Паводле звестак японскіх метэаролагаў, яна захопіць і зіму. Імавернасць такога варыянта Упраўленне метэаралогіі Японіі ацэньвае ў 70%. Зрэшты, амерыканскія метэаролагі настроены больш аптымістычна. Яны лічаць, што рызыка ў параўнанні з чэрвенем, калі яна складала 75%, знізілася зараз да 35—45%.

Пад уздзеяннем Ла-Ніны цэны на вугаль у Еўропе ў трэцім і чацвёртым кварталах могуць павялічыцца на 18 і 27% адпаведна, мяркуе аналітык нарвежскай кансалтынгавай фірмы Nena AS Дзіяна Басіла. Але гэта адбудзецца ў выпадку, калі сітуацыя будзе развівацца па экстрэмальным сцэнарыі, дадала эксперт. І гэта не самы аптымістычны прагноз. У ліпені фінансавая карпарацыя Citigroup нават выказала здагадку, што цэны на вугаль у Азіяцка-Ціхаакіянскім рэгіёне могуць падскочыць на 50%, калі ўплыў моцных дажджоў разам са скарачэннем вытворчасці вугалю ў Кітаі акажацца больш моцным, чым чакалася раней.

Сусветны лідар — індыйская кампанія Coal India Ltd. — у пачатку верасня паведаміла аб зніжэнні вытворчасці. Цяпер яна здабывае мінімальную колькасць вугалю за апошнія тры гады. Гэта ў кампаніі тлумачаць моцнымі дажджамі і пратэстамі шахцёраў, якія патрабуюць павышэння заробкаў. Вядома, не ўсе эканамісты і сіноптыкі лічаць, што Ла-Нінья падштурхне попыт на вугаль. Але і без гэтай прыроднай з'явы вугаль мае патэнцыял для далейшага росту. «На фоне павелічэння экспарту ў Кітай, а таксама забастовак шахцёраў у Індыі вугаль атрымаў рэальны імпульс», — канстатуе аналітык Commerzbank Барбара Ламбрэхт.

### ГРОШЫ НА ВЕЦЕР

Вугаль застаецца асноўным палівам для электрастанцый у свеце. Каля 70% ад агульнага аб'ёму здабычы вугалю ідзе на вытворчасць электраэнергіі. Доля вугальных электрастанцый у сусветным аб'ёме складае больш за 40%. Ёсць тут свае «падводныя камяні». Па звестках Global Climate Project, штогадовы аб'ём сусветных выкідаў $CO_2$ ацэньваецца ў больш чым 35 млрд тон. Больш за дзве трэція з іх выпрацоўваюцца шляхам спальвання выкапнёвага паліва.

Летась у снежні прадстаўнікі 195 краін свету падпісалі ў Парыжы новае кліматычнае пагадненне ААН, якое прадугледжвае скарачэнне аб'ёмаў выкіду парніковых газаў пасля 2020 года. Будуць распрацаваны правілы выканання пагаднення, дзе будзе вызначана, якім чынам падтрымліваць краіны, што развіваюцца, на шляху пераходу да чыстай энергетыкі. Зразумела, што такі паварот ударыць па традыцыйнай вугальнай прамысловасці, на долю якой прыпадае большая частка выкідаў забруджвальных рэчываў. Як вядома, пры спальванні 1 тоны вугалю ўтвараецца каля 2,7 тоны вуглякіслага газу.

Пераход да больш чыстых відаў сыравіны і вытворчасці электраэнергіі пацягне за сабой зніжэнне спажывання традыцыйных відаў вугалю. За апошнія 15 гадоў у Еўрасаюзе пабудаваны 140 ГВт ветраных і 90 ГВт сонечных электрастанцый (напрыклад, гэта практычна адпавядае ўсталяванай магутнасці ўсёй расійскай электраэнергетыкі), якія шмат у чым заменяць старыя вугальныя станцыі.

У ЗША пабудаваныя 70 ГВт ветраных станцый і больш за 30 ГВт сонечных станцый, ідзе перавод вугальных станцый на сланцавы газ. Кітай, нягледзячы на дамінаванне вугалю ў энергабалансе, ужо таксама набліжаецца да лідарства ў сферы аднаўляльнай энергетыкі: тут пабудаваны больш за 140 ГВт ветраных электрастанцый і больш за 40 ГВт сонечных станцый. Будучыня вугальнай галіны нават стала адной з галоўных тэм передвыбарнай прэзідэнцкай гонкі ў ЗША. Большасць прыхільнікаў Дэмакратычнай партыі выступаюць за пераход на больш чыстыя ў параўнанні з вугалем крыніцы энергіі. Рэспубліканцы ж заяўляюць пра цяжкія наступствы для эканомікі з-за скарачэння працоўных месцаў у вугальнай галіне.

Аднак не ўсе гатовыя скарачаць вытворчасць. Вугаль будзе заставацца прывабным відам паліва для тых рэгіёнаў, якія менш прывабныя для доўгатэрміновых інвестыцый у новыя аб'екты генерацыі. Гэта ў тым ліку тычыцца постсавецкай прасторы, дзе галоўнымі спажыўцамі вугалю выступаюць цеплазабеспячальныя станцыі, якія працуюць у рэжыме кагенерацыі — адначасовай выпрацоўкі і цеплавой, і электрычнай энергіі. У прыватнасці, ва Украіне, дзе дамінуе цэнтральнае ацяпленне, з 14 ЦЭС на вугалі працуюць сем.

У планах расійскіх уладаў пакуль не значыцца адмова ад вугальнай генерацыі ці яе скарачэнне, тым больш у некаторых рэгіёнах з прычыны моцнай аддаленасці ад газавай інфраструктуры і з-за адсутнасці неабходных параметраў для арганізацыі гідраэнергастанцый вугаль застаецца, па сутнасці, адзіным прымальным відам паліва. Акрамя гэтага, дзеючая стратэгія развіцця вугальнай прамысловасці мяркуе павелічэнне здабычы і паставак як для знешняга, так і для ўнутранага рынку. Да 2030 года Расія павінна павялічыць здабычу вугалю да 410—480 млн т. Экспарт, як мяркуюць складальнікі стратэгіі, павінен павялічыцца да 240 млн т, у асноўным у краіны Азіяцка-Ціхаакіянскага рэгіёна. Супраць зніжэння вугальнай генерацыі рэзка выступаюць у профільных прафсаюзах, якія папярэджваюць аб небяспецы ўзнікнення сацыяльнай напружанасці і росце тарыфаў на энергарэсурсы. Яны ўдакладняюць, што доля вугальнай энергетыкі Сібіры ў сумарных выкідах вуглякіслага газу складае ўсяго 5%.

Так што вугаль «спісваць» пакуль не варта. Прынамсі ў найбліжэйшай перспектыве.

**Захар БУРАК.**
*burak@zviazda.by*


## ОБЪЯВЛЕНИЕ О ТОРГАХ

| | |
|---|---|
| **Наименование (описание) имущества и его стоимость** | **Лот №1.** Объект недвижимости – капитальное строение с инвентарным номером 240/С-28863, расположенное по адресу: Витебская область, г. Орша, ул. Мира, д. 39А, площадь – 5,688 кв.м, назначение – административно-инженерный корпус. Начальная стоимость лота – 12.232.716 белорусских рублей. (Залог ОАО «Белгазпромбанк»). |
| **Собственник (владелец) имущества** | ОАО «Оршанский инструментальный завод», УНП 300207906, юридический адрес: Витебская область, г. Орша, ул. Мира, 39А |
| **Местонахождение имущества** | г. Орша, ул. Мира, 39А Контактные лица по вопросам осмотра имущества и получения дополнительной информации: Бегляк Александр Сергеевич: т.р. 8 0216 21 64 43, т.м. +37529 365 46 42; Степанова Татьяна Владимировна: 80216 21 68 81, т.м. +37529 219 22 47 |
| **Наличие обременений** | Залог ОАО «Белгазпромбанк» |
| **Место (адрес), дата и время проведения торгов** | Отдел принудительного исполнения управления принудительного исполнения главного управления юстиции Витебского облисполкома г. Витебск, ул. Богдана Хмельницкого, 10/1 27 июня 2016 года в 14.00 |
| **Справочная информация об организаторе торгов** | Отдел принудительного исполнения управления принудительного исполнения главного управления юстиции Витебского облисполкома 210015, г. Витебск, ул. Богдана Хмельницкого, д. 10/1, каб. 2.5 Судебный исполнитель Богданова Ольга Евгеньевна, тел. (0212) 62 03 40, т.м. 375-33-687-91-63 Начальник отдела Бураков Игорь Вячеславович, тел. (0212) 61 40 15 |
| **Условия и порядок проведения торгов** | 1. Подать письменную заявку на участие в торгах и дать подписку об отсутствии препятствий для приобретения имущества, предусмотренных законодательством. 2. Внести задаток в размере 10 процентов от стоимости имущества на депозитный счет управления принудительного исполнения главного управления юстиции Витебского облисполкома № 3642903001066 филиала № 200 – Витебского областного управления ОАО «АСБ Беларусбанк», код 635, УНП 300002505 **не позднее 14.00 24 июня 2016 года.** Минимальная величина первого шага торгов – 5% стоимости лота. В соответствии с пунктом 1 Указа Президента Республики Беларусь от 05.05.2009 № 232 «О некоторых вопросах проведения аукционов (конкурсов)» возмещение затрат на организацию и проведение торгов осуществляется участником, выигравшим торги. |

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ТОРГОВ В ФОРМЕ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА
**Организатор аукциона: государственное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», г. Витебск, проезд Гоголя, 5, тел. (0212) 42-61-62**

**Продавец: Открытое акционерное общество «Витязь», 210605, Витебская обл., г. Витебск, ул. П. Бровки, 13а, 8 (0212) 57-85-08.**

Лот №1. Бильярдный стол «Магнат» 12 (инв. №08610006). Нач. цена: 39 700 000 бел. руб. без НДС. Задаток: 3 970 000 бел. руб.

Аукцион состоится **29.06.2016 в 11.00** по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5, в ККУП «Витебский областной центр маркетинга». Срок внесения задатков и приема документов: с 27.05.2016 с 8.30 по 28.06.2016 до 17.30. Срок заключения договора купли-продажи: 20 календарных дней со дня проведения аукциона, оплата за объект производится в порядке и сроки, установленные договором купли-продажи. Условие аукциона: возмещение затрат по оценке имущества в размере 974 000 бел. руб., оплата НДС сверх цены продажи объекта. Имущество расположено по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. П. Бровки, 34/2.

**Продавец: Открытое акционерное общество «Доломит», Витебская обл., г. Витебск, г/п Руба, ул. Центральная, 23, 8 (0212) 57-85-08.**

Лот №1. Изолированное помещение с инв. №200/D-176885 по адресу: Витебская обл., Витебский р-н, г/п Руба, ул. Центральная, 19А-1, площадью 15,8 кв.м, назначение – помещение коммунального хозяйства, наименование – помещение хозсарая. Нач. цена: 5 642 730 бел. руб. без НДС. Задаток: 564 000 бел. руб.

Лот №2. Изолированное помещение с инв. № 200/D-176887 по адресу: Витебская обл., Витебский р-н, г/п Руба, ул. Центральная, 19А-2, площадью 16 кв.м, назначение – помещение коммунального хозяйства, наименование – помещение хозсарая. Нач. цена: 5 715 070 бел. руб. без НДС. Задаток: 571 000 бел. руб.

Лот №3. Изолированное помещение с инв. № 200/D-176888 по адресу: Витебская обл., Витебский р-н, г/п Руба, ул. Центральная, 19А-3, площадью 15,4 кв.м, назначение – помещение коммунального хозяйства, наименование – помещение хозсарая. Нач. цена: 5 500 000 бел. руб. без НДС. Задаток: 550 000 бел. руб.

Лот №4. Изолированное помещение с инв. № 200/D-176889 по адресу: Витебская обл., Витебский р-н, г/п Руба, ул. Центральная, 19А-4, площадью 14,4 кв.м, назначение – помещение коммунального хозяйства, наименование – помещение хозсарая. Нач. цена: 5 142 200 бел. руб. без НДС. Задаток: 514 000 бел. руб.

Лот №5. Капитальное строение с инв. № 200/С-51431, площадью 53,7 кв.м, назначение, наименование – здание неустановленного назначения, по адресу: Витебская обл., г/п Руба, ул. Центральная, д. 23а, на зем. участке площадью 0,0316 га. Нач. цена: 70 000 000 бел. руб. без НДС. Задаток: 7 000 000 бел. руб.

Лот №6. Капитальное строение с инв. № 200/С-96175, общая площадь застройки 1768 кв.м, назначение – сооружение специализированное складов, хранилищ, наименование – силосный склад цеха №2, по адресу: Витебская обл., Витебский р-н, г/п Руба, ул. Центральная, 25/31, на зем. участке площадью 41,6313 га (долевая аренда). Нач. цена: 1 015 000 000 бел. руб. без НДС. Задаток: 101 500 000 бел. руб.

Аукцион состоится **29.06.2016 в 15.00** по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5, в ККУП «Витебский областной центр маркетинга». Срок внесения задатков и приема документов: **с 27.05.2016 с 8.30 по 28.06.2016 до 17.30.** Срок подписания договора купли-продажи: 5 рабочих дней со дня проведения аукциона, оплата за объект производится в порядке и сроки, установленные договором купли-продажи. Условие аукциона: возмещение затрат по оценке имущества, оплата НДС сверх цены продажи объекта.

**Заявления на участие в аукционе со всеми необходимыми документами принимаются в рабочие дни с 8.30 до 17.30 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, д. 5 в ККУП «Витебский областной центр маркетинга».** Аукцион проводится в порядке, установленном Постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 12.07.2013 № 609. Лица, желающие участвовать в аукционе, обязаны подать организатору аукциона заявление на участие в аукционе, подписать соглашение установленной формы с приложением документов: документ, подтверждающий внесение суммы задатка на р/счет, указанный в извещении, с отметкой банка; юр. лицом или индивидуальным предпринимателем РБ – копия документа, подтверждающего гос. регистрацию юр. лица или индивидуального предпринимателя, без нотариального засвидетельствования; иностранным юр. лицом – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны учреждения (выписка должна быть произведена не ранее шести месяцев до подачи заявления на участие в торгах) либо иное эквивалентное доказательство юр. статуса в соответствии с законодательством страны учреждения с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык; иностранным индивидуальным предпринимателем – легализованный в установленном порядке документ, подтверждающий статус, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык; представителем юридического лица РБ – доверенность (кроме случаев, когда юр. лицо представляет его руководитель); представителем гражданина или индивидуального предпринимателя РБ – нотариально удостоверенная доверенность; представителем иностранного юр. лица, иностранного физ. лица или индивидуального предпринимателя – доверенность, легализованная в установленном законодательством порядке, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык. При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, руководитель юр. лица – документ, подтверждающий его полномочия. **Победитель аукциона (единственный участник аукциона) обязан**: перечислить затраты на организацию и проведение аукциона, возместить затраты по оценке имущества на расчетный счет, указанный в протоколе аукциона в течение 3 (трех) рабочих дней со дня проведения аукциона. **Задаток перечисляется на р/с 3012078870010, ЦБУ №2 ЗАО «МТБанк», г. Витебск, ул. Ленина, 17, БИК 153001117, УНП 390477566, получатель платежа ККУП «Витебский областной центр маркетинга».** Ознакомление с объектами осуществляется в рабочие дни с 8.30 до 17.00. Организатор аукциона вправе в любое время, но не позднее, чем за 3 дня до даты проведения аукциона, отказаться от проведения аукциона. Дополнительную информацию можно получить по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5, **тел.: (0212) 42-61-62, (029) 510-07-63, e-mail: vcm74@mail.ru, marketvit.by.**

# ФУТБОЛ, ДЗЕ ГУЛЯЮЦЬ ТОЛЬКІ ГАЛАВОЙ

Разумныя грошы

Сумесны праект газеты «ЗВЯЗДА» і кампаніі VISA

**У апошнія дні верасня кампанія Visa сумесна з Асацыяцыяй беларускіх банкаў запускае ў нашай краіне адукацыйную гульню «Фінансавы футбол 2.0», якая з'яўляецца абноўленай лакалізаванай версіяй займальнай камп'ютарнай гульні для атрымання фінансавых ведаў.**


Ігар КАВАЛЁЎ

Гэтая відэагульня з'яўляецца часткай глабальнай ініцыятывы Visa па павышэнні фінансавай адукаванасці сярод моладзі, а наша краіна стала адной з больш чым 40 краін, дзе гуляюць у «Фінансавы футбол». Упершыню гульня была запушчана ў нас у 2010 годзе, а ў верасні 2016 года выпушчана яе абноўленая версія. «Фінансавы футбол» правярае веды гульца ў галіне кіравання асабістымі фінансамі і вучыць правільна распараджацца сваімі грашыма па меры таго, як ён прасоўваецца да брамы саперніка, каб забіць гол.

Гульня «Фінансавы футбол. 2.0» размешчана на сайце **http://www.by.financialfootball.com.**

«Кампанія Visa ўжо больш за дзесяць гадоў займаецца распрацоўкай праграм, накіраваных на павышэнне фінансавай адукаванасці грамадзян. Фінансавыя веды даюць магчымасць навучыцца выбудоўваць асабісты бюджэт, кантраляваць свае выдаткі і зберажэнні. А павышэнне агульнай фінансавай адукаванасці спрыяе росту дабрабыту людзей і эканамічнаму развіццю грамадства. Адной з праграм кампаніі Visa з'яўляецца гульня «Фінансавы футбол», якая сваёй нязмушанай займальнай манерай падачы фінансавых ведаў прыцягвае ўвагу моладзі і дарослых людзей ва ўсім свеце, у тым ліку аматараў футбола», — сказаў **рэгіянальны менеджар Visa ў Рэспубліцы Беларусь, Малдове і Азербайджане Ігар КАВАЛЁЎ.**

# КАБ БЫЦЬ З ФІНАНСАМІ НА РОЎНЫХ

**Наш спецыяльны карэспандэнт Сяргей КУРКАЧ пратэсціраваў свае фінансавыя веды на дэма-версіі гэтай займальнай камп'ютарнай гульні і зрабіў для сябе пэўныя высновы, на аснове якіх і падрыхтаваў для чытачоў газеты своеасаблівыя памяткі. Спадзяёмся, што яны стануць карыснымі для многіх з вас менавіта пры вырашэнні рэальных фінансавых задач.**

## ЭКАНОМІМ ГРОШЫ. ПАРА ПАЧЫНАЦЬ

### Не проста заначка

Хутчэй за ўсё ўсе мы ўжо пакрысе эканомім грошы, адкладаючы іх «у панчоху» або на дэпазіт. Цікава, а які працэнт паступленняў павінен ісці ў ашчадны фонд?

- Эксперты раяць зберагаць мінімум 10% ад сукупнага даходу.
- Агульная сума зберажэнняў на неспадзяваны выпадак павінна забяспечваць выдаткі на перыяд не менш за 6 месяцаў.
- Наяўнасць зберажэнняў на непрадбачаныя выдаткі дае пачуццё абароненасці і надае ўпэўненасці ў выпадку хваробы, звальнення ці неабходнасці аддаць аўтамабіль у рамонт.

Галоўнае правіла зберажэнняў: **ПЛАЦІ САБЕ Ў ПЕРШУЮ ЧАРГУ.**

Скарбонкі добрыя для дробязі, але пры сур'ёзным падыходзе варта падумаць аб ашчадных рахунках. Калі захоўваць грошы дома, то сума зберажэнняў будзе заставацца нязменнай. Калі ж адкрыць дэпазіт, то сума ўкладу будзе павялічвацца не толькі падчас папаўнення рахунку, але і за кошт назапашвання працэнтаў.

### Выбіраем уклад

Існуе некалькі ашчадных механізмаў, уключаючы традыцыйныя ўкладныя рахункі «да запатрабавання», тэрміновыя дэпазітныя рахункі, ашчадныя сертыфікаты і індывідуальныя пенсійныя рахункі.

Тэрміновыя дэпазіты падраздзяляюцца на **безадзыўныя і адзыўныя**. Па безадзыўных дэпазітах вяртанне ўкладу да заканчэння тэрміну дагавора не прадугледжана. Па адзыўных — па патрабаванні ўкладчыка сума дэпазіту можа быць вернута датэрмінова.

**Падбор дэпазіту ў 4 этапы:**

1. Вызначыць мэту назапашвання зберажэнняў.
2. Вырашыць, наколькі важная магчымасць хутка вярнуць свае грошы. Гэта называецца **ліквіднасцю.**
3. Вызначыцца з памерам дэпазіту.
4. Знайсці прапанову з лепшай **працэнтнай стаўкай** пры мінімальным памеры банкаўскіх збораў.

Напрыклад, калі вы хочаце мець магчымасць у любы час зняць грошы з рахунку праз банкамат, то вам патрабуецца высокаліквідны ашчадны рахунак. Як правіла, традыцыйны ўкладны рахунак ці ўклад **«да запатрабавання»** прапануе найбольш высокі ўзровень ліквіднасці, але пры гэтым працэнтная стаўка па ім значна ніжэйшая, чым па тэрміновых дэпазітах.

З гэтых двух варыянтаў больш высокую працэнтную стаўку банкі прапаноўваюць па тэрміновых укладах (дэпазітах). Але трэба прымаць у разлік, што з даходаў, атрыманых па дэпазітах у беларускіх рублях, размешчаных на тэрмін менш як 1 год, і па дэпазітах у замежнай валюце, размешчаных на тэрмін менш за 2 гады, прадугледжана спагнанне падаходнага падатку.



## БАЛАНС ЯК АСНОВА БЮДЖЭТУ

### «Трэба» або «Хочацца»

Для пабудовы рэалістычнага сямейнага або персанальнага бюджэту неабходна ўсведамляць розніцу паміж пакупкамі на надзённыя патрэбы і пакупкамі дзеля задавальнення сваіх жаданняў. Тое, што вам трэба, — гэта неабходныя выдаткі, звязаныя з таварамі і паслугамі, якія будуць патрэбны для падтрымання стабільнага жыццёвага ўзроўню. Тое, што вам хочацца, — гэта пажаданыя пакупкі, без якіх цалкам можна абысціся ў паўсядзённым жыцці. Калі вы марнуеце грошы на тое, што вам хочацца, але на самай справе не вельмі трэба, то вы здзяйсняеце неабавязковыя выдаткі. Але нават фінансісты лічаць, што падобныя марнаванні — гэта не абавязкова дрэнна. На самай справе імкненне да набыцця таго, што вам хочацца, можа быць цудоўным стымулам для зберажэнняў.

### Пошук балансу

Каб зразумець, наколькі збалансаваны ваш бюджэт, дастаткова скласці ўсе даходы і адняць усе выдаткі. У выніку вы атрымаеце чысты прыбытак або страту.

Калі даходы перавышаюць выдаткі, гэта добра — значыць вы жывяце па сродках. Таксама гэта азначае, што вы можаце павялічыць суму сваіх зберажэнняў. Калі ж баланс атрымаецца адмоўным, то вашы штомесячныя выдаткі перавышаюць даходы. Іншымі словамі, вы жывяце не па сродках. Калі вы не хочаце, каб ваш доўг рос як снежны ком, вам прыйдзецца скараціць выдаткі або павялічыць даходы. А яшчэ лепш — зрабіць і тое, і другое. Штомесячны аналіз бюджэту — гэта адзіны спосаб гарантаваць, што вы кіруеце сваімі фінансамі найлепшым чынам.

### Як не патрапіць у фінансавую пастку

Існуе дзве асноўныя рызыкі, якія могуць пагражаць нашым фінансам. Гэта — даўгі і крадзеж асабістых даных.

**На што варта звяртаць увагу, каб не загразнуць у даўгах**

Пры адсутнасці належнага кіравання крэдыт можа ператварыцца ў некіруемы доўг. Таму рэкамендуецца прытрымлівацца трох правілаў, каб потым выкарыстоўваць крэдыты сабе на карысць і не апынуцца ў даўгах.

**1. Пазбягайце непатрэбных пакупак**

Кожны раз перад набыццём чаго-небудзь, задайце сабе чатыры простыя пытанні. Мне сапраўды гэта трэба ці проста хочацца? А гэта мне па сродках? Якім чынам я аплачу гэтыя выдаткі? Чым я магу рызыкаваць пасля такой пакупкі? Імпульсіўнае расходаванне сродкаў, калі рашэнні прымаюцца спантанна без уліку рэальных патрэбаў і фінансавых магчымасцяў, з'яўляецца адным з пэўных спосабаў апынуцца ў даўгах.

**2. Не выходзьце за рамкі бюджэту**

Сфарміраваўшы бюджэт і застаючыся ў яго рамках, вы зможаце дакладна ведаць, якую суму маеце. Калі купля парушае бюджэтны баланс, то вам, магчыма, прыйдзецца зрэзаць іншыя выдаткі або пачакаць з набыццём да таго часу, пакуль не збярэцца неабходная сума.

**3. Жывіце па сродках**

Гэта значыць, што вашыя выдаткі не павінны перавышаць даходы. Калі вы жывяце не па сродках і набываеце тавары ў крэдыт, які не ў стане неадкладна пагасіць, варта альбо зрэзаць выдаткі, альбо павялічыць даходы.

Адказы на тэст: I — 4, II — 3, III — 4, IV — 2, V — 3, VI — 2, VII — 3.

# ЯК АСЛАБІЦЬ ДАЎГАВЫ ЦЯЖАР?

Па-першае, варта абмежаваць непатрэбныя траты. Запісвайце кожную выдаткаваную капейку і ў канцы месяца вызначайце пазіцыі, без якіх вы цалкам можаце абысціся. Неабходна вызначыць велічыню запазычанасці і скласці план выплаты доўгу. Большасць экспертаў рэкамендуюць у першую чаргу выплачваць пазыкі з самай высокай працэнтнай стаўкай і пры гэтым працягваць ажыццяўляць мінімальныя плацяжы па ўсіх астатніх рахунках.

## Як абараніцца ад крадзяжу асабістай інфармацыі

**1)** Калі ваша крэдытная, дэбетавая картка або карта экспрэс-аплаты страчана або ўкрадзена, неадкладна паведаміце пра гэта банку-эмітэнту. На ўсялякі выпадак трымайце ў надзейным месцы спіс нумароў вашых крэдытных і дэбетавых картак разам з тэлефоннымі нумарамі адпаведных эмітэнтаў.

**2)** Заказваючы тавар у інтэрнэт-краме, лепш аддаваць перавагу тым рэсурсам, якія размешчаны на абароненых вэб-сайтах. Выкарыстоўвайце абароненыя каналы сувязі (Secure Socket Layer — SSL), каб засцерагчы вашы трансакцыі ад замахаў хакераў.

**3)** Захоўвайце ў сакрэце нумары плацежных карт і адпаведных банкаўскіх рахункаў. Не паведамляйце гэтыя нумары любому, хто звязваецца з вамі па тэлефоне ці электроннай пошце. Нумары плацежных сродкаў можна раскрываць толькі ў тым выпадку, калі вы тэлефануеце ў адпаведную арганізацыю самі.

**4)** Знішчайце любыя непатрэбныя дакументы і чэкі, калі на іх ёсць вашыя плацежныя даныя.

**5)** Ніколі не перасылайце свае плацежныя даныя па e-mail, бо электронная пошта можа быць перахоплена.



**6)** Ніколі нікому не раскрывайце свой ПІН-код. Калі ў вас ёсць магчымасць самому выбраць ПІН-код, хай гэта будзе выпадковая камбінацыя лічбаў, якую вы зможаце запомніць. Пазбягайце відавочных камбінацый, звязаных з вашай асабістай інфармацыяй (датай нараджэння, адрасам і г. д.). Ніколі не захоўвайце ПІН-код побач з карткай, напрыклад, у партманеце, і тым больш не пішыце яго на адвароце свайго «пластыка».

**7)** Штомесяц правярайце выпіскі аб руху грашовых сродкаў па рахунку.

# НАКОЛЬКІ ВЫ КРЭДЫТАЗДОЛЬНЫ?

Калі вы выкарыстоўваеце крэдытную карту або бераце крэдыт, то пачынаеце будаваць сваю крэдытную гісторыю. Неабходна пазбягаць памылак, якія сапсуюць вашу рэпутацыю крэдытаатрымальніка. Пераацэнка сваіх магчымасцяў можа прывесці да таго, што вас яшчэ доўга будуць лічыць некрэдытаздольным, і тады прыйдзецца выдаткаваць шмат часу і намаганняў, каб направіць сваю крэдытную гісторыю і рэпутацыю.

**Пры ацэнцы банкамі вашай крэдытаздольнасці ўлічваецца тры фактары:**

✓ **крэдытная гісторыя** — наколькі акуратна вы выконвалі свае фінансавыя абавязацельствы ў мінулым;

✓ **капітал** — усе вашы актывы, у тым ліку нерухомасць, зберажэнні і інвестыцыі;

✓ **плацежаздольнасць** — якую суму запазычанасці вы зможаце абслугоўваць (гэта значыць, паступова пагашаць), зыходзячы са свайго бягучага даходу.

## Рэйтынг крэдытаздольнасці і справаздача аб крэдытных аперацыях

Інфармацыя аб вашай крэдытнай гісторыі збіраецца ў рамках справаздачы аб крэдытных аперацыях. Банкі маюць магчымасць азнаёміцца з данымі справаздачы перад тым як прыняць рашэнне аб выдачы вам крэдыту.

Вы таксама штогод маеце права на аднаразовае бясплатнае азнаямленне з уласнай справаздачай аб крэдытных аперацыях. Пры гэтым неабходна рэгулярна і ўважліва аналізаваць звесткі, якія прыведзены ў гэтай справаздачы. Варта пераканацца ў тым, што дакумент не ўтрымлівае няправільнай інфармацыі або звестак аб ашуканскіх транзакцыях, якія могуць нашкодзіць вашай крэдытнай гісторыі.

**1)** Трэба цалкам пагашаць запазычанасць па крэдытнай карце кожны месяц. Калі гэта немагчыма, то выплачвайце столькі, колькі зможаце. Банк таксама цікавіцца розніцай паміж сумай запазычанасці па крэдытнай карце і крэдытным лімітам. Чым вышэйшы нявыкарыстаны крэдытны ліміт, тым лепшая ваша рэпутацыя як крэдытаатрымальніка. Калі выкарыстоўваць крэдытную карту з розумам, то яна дапаможа палепшыць вашу крэдытную гісторыю.

**2)** Калі вы не можаце своечасова зрабіць плацеж па крэдыце, то паспрабуйце дамовіцца з банкам аб рэструктурызацыі плацяжоў, каб пазбегнуць іх пратэрміноўкі. Хутчэй за ўсё, вам удасца прыйсці да пагаднення, і вы пачняце плаціць у прызначаны тэрмін столькі, колькі зможаце. Такім чынам, вы пазбегнеце штрафу за пратэрміноўку і захаваеце станоўчую крэдытную гісторыю.


Студэнты БДЭУ падчас лекцыі па фінансавай адукаванасці.



Лекцыю вядзе кандыдат юрыдычных навук, дацэнт кафедры Міжнароднага эканамічнага права БДЭУ Юлія ХВАЦІК.

**Новыя веды аб асабістых фінансах атрымалі студэнты Беларускага дзяржаўнага эканамічнага ўніверсітэта (БДЭУ) падчас лекцый, якія былі арганізаваны ў верасні кампаніяй Visa і Асацыяцыяй беларускіх банкаў.**

# ПРАВЕР СЯБЕ

**Спадзяёмся, што вам была карыснай падрыхтаваная намі інфармацыя. А цяпер паспрабуйце адказаць на невялікі тэст ад кампаніі Visa. Пераканайцеся ў тым, што вы з фінансамі сапраўды на роўных.**

**I) Крэдытныя карты могуць:**

- ❑ 1) Дапамагчы вам сфарміраваць крэдытную гісторыю.
- ❑ 2) Прывесці да высокіх працэнтных плацяжоў, калі вы несвоечасова аплачваеце рахункі.
- ❑ 3) Быць выкарыстаны для аплаты пакупак праз інтэрнэт.
- ❑ 4) Усё пералічанае.

**II) Калі вы пагасілі запазычанасць па крэдытнай карце пасля вызначанай даты, з вас сычучуць:**

- ❑ 1) Камісію за выдачу наяўных грашовых сродкаў.
- ❑ 2) Камісію па зменнай стаўцы.
- ❑ 3) Павышаныя працэнты па пратэрмінаванай суме.
- ❑ 4) Працэнты за карыстанне авердрафту.

**III) Магчымым наступствам дрэннай крэдытнай гісторыі з'яўляецца:**

- ❑ 1) Павелічэнне аплаты камунальных паслуг.
- ❑ 2) Зніжэнне працэнтнай стаўкі па іпатэцы.
- ❑ 3) Накладанне арышту на ваш рахунак да запатрабавання.
- ❑ 4) Адхіленне вашай заяўкі на крэдыт.

**IV) Лепшы спосаб эканоміць на магчымых камісіях за карыстанне банкаматам — гэта:**

- ❑ 1) Абмежаваць аперацыі па зняцці наяўных грошай да 10 у месяц.
- ❑ 2) Здымаць наяўныя сродкі толькі ў банкаматах сеткі свайго банка.
- ❑ 3) Карыстацца банкаматам толькі ў працоўны час.
- ❑ 4) Усё пералічанае.

**V) Пры выбары асабістага ідэнтыфікацыйнага нумара для сваёй дэбетавай карты варта:**

- ❑ 1) Выкарыстоўваць лічбы даты нараджэння.
- ❑ 2) Запісаць нумар на адваротным баку карты.
- ❑ 3) Выбраць выпадковы лік, які вы можаце запомніць.
- ❑ 4) Выкарыстоўваць камбінацыю 1234.

**VI) Пры атрыманні чэка з банкамата варта:**

- ❑ 1) Неадкладна выкінуць яго ў скрыню.
- ❑ 2) Знішчыць яго пасля праверкі выпіскі з рахунку.
- ❑ 3) Выслаць яго разам з рахункам па плацяжах за карыстанне крэдытнай картай.
- ❑ 4) Захоўваць на працягу ўсяго перыяду дзеяння картрахунку.

**VII) Што з'яўляецца патэнцыйным недахопам выкарыстання карты з магчымасцю авердрафту?**

- ❑ 1) Складанасць па адсочванні пакупак.
- ❑ 2) Гэта менш бяспечна, чым выкарыстанне наяўных грошай.
- ❑ 3) Можна ўлезці ў даўгі.
- ❑ 4) Складанасць афармлення такіх карт у банку.

*(Правільныя адказы вы знойдзеце ў левым ніжнім куце нашага праекта)*



Падрыхтаваў Сяргей КУРКАЧ. УНП 190466062

■ Спорт-тайм

# НАШЫ ПРЫГАЖУНІ ЕДУЦЬ У ЕЎРОПУ

**У штотыднёвым спартыўным аглядзе «Звязды» расказваем пра тое, як айчынныя валейбалісткі прабіліся на кантынентальны чэмпіянат, тэнісісткі выступілі на прэстыжным турніры WTA і як стартавалі гандбалісты ў Лізе чэмпіёнаў.**

***1. Жаночая зборная Беларусі па валейболе выйшла ў фінальную стадыю чэмпіянату Еўропы 2017 года, заняўшы па выніках адборачнага турніру ў групе F першае месца.*** Пасля стартавага круга ў чэшскім Брно беларускі займалі лідзіруючую пазіцыю ў квартэце, але на старце другой часткі адборачнага раўнда ў Марыборы пацярпелі паражэнне ад Чэхіі, што ўскладніла задачу атрымаць пуцёўку на чэмпіянат Еўропы напрамую. Але ў другім туры зборная Беларусі была мацнейшая за каманды Славеніі і Грэцыі, таму ёй усё ж удалося ўтрымаць першае месца і трапіць на прэстыжны кантынентальны турнір.

Фінальная частка чэмпіянату Еўропы пройдзе ў кастрычніку 2017 года ў Азербайджане і Грузіі. Наша зборная восьмы раз пры гэтым удзел у фінальнай стадыі чэмпіянату кантынента. Упершыню за 16 гадоў беларускі прабіліся на форум, заняўшы першае месца ў адборачнай групе.

***2. Вольга Гаварцова і Вера Лапко занялі другое месца на буйным тэнісным турніры WTA ў кітайскім Гуанчжоў.*** У фінале парнага разраду беларускі прайгралі амерыканска-кітайскаму дуэту Айша Мухамад / Шуай Пенг — 2:6, 6:7. У ходзе турніру Вольга Гаварцова і Вера Лапко абыгралі ў пары вядомых тэнісістак, былых першых ракетак свету ў адзіночным разрадзе Марціну Хінгіс і Алену Янкавіч, дзякуючы чаму і выйшлі ў фінал.

***3. Брэсцкі гандбольны клуб імя Мяшкова ў першым матчы Лігі чэмпіёнаў дома саступіў польскаму «Віве» — 24:29.*** Па ходу сустрэчы брэсцкія гандбалісты вялі ў ліку, але не змаглі ўтрымаць сваю перавагу ў некалькі мячоў да канца матча.

Наступную гульню ў Лізе чэмпіёнаў Брэсцкі гандбольны клуб імя Мяшкова правядзе 1 кастрычніка на выездзе супраць македонскага «Вардара». Нагадаем, у сёлетнім сезоне ў Лізе чэмпіёнаў «мяшкоўцы» трапілі ў групу В. Акрамя каманд з Македоніі і Польшчы, іх чакаюць супрацьстаянні з нямецкім «Райн Левен», харвацкім «Загрэбам», венгерскім «Пікам», славенскай «Цэле» і шведскім «Крысціанстадам». Пераможца атрымае прамы пропуск у чвэрцьфінал. Дружыны, якія занялі месцы з другога па шостае, выйдуць у 1/8 фіналу.

***4. Адбыліся паўфінальныя матчы Кубка свету па хакеі.*** Зборная Расіі саступіла сапернікам з Канады з лікам 3:5, а зборная Еўропы аказалася мацнейшай за каманду Швецыі — 3:2. Пераможца Кубка свету вызначыцца ў фінальнай серыі да двух перамог, першая сустрэча адбудзецца 28 верасня а 3-й гадзіне ночы па мінскім часе.

Нагадаем, Кубак свету праходзіць пад эгідай Нацыянальнай хакейнай лігі і праводзіцца трэці раз у гісторыі. Раней уладальнікамі ганаровага трафея ў 1996 годзе станавіліся хакеісты ЗША, у 2004-м — Канады.

**Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.**
*lobazhevich@zviazda.by*



■ Ну і ну!

## УКРАДЗЕНЫЯ ТЭЛЕФОНЫ ПАДАРЫЎ РОДЗІЧАМ

**У сталіцы праваахоўнікі затрымалі жыхара гарпасёлка Плешчаніцы, які за ноч украў два мабільныя тэлефоны.**

Паводле інфармацыі Савецкага РУУС Мінска, малады чалавек, добра «заліўшы за каўнер» дома, вырашыў працягнуць «культурна адпачынак» у адным са сталічных клубаў. Праўда, нейкім дзіўным чынам. Напачатку ён забраў пакінуты на барнай стойцы адзін мабільнік, а затым украў другі з сваёй новай знаёмай. З дзяўчынай ён сустрэўся каля ўваходу ў клуб і прапанаваў пракаціцца па начным горадзе. Пасля непрацяглых стасункаў тая выйшла з машыны і толькі праз нейкі час выявіла, што забылася ў аўто сумачку. Апошняя патрапіла на вочы і кіроўцу. Вывучыўшы яе змесціва, той забраў мабільны тэлефон, а сумачку выкінуў. Адзін апарат зладзюжка падарыў дачцэ, а другі — стрыечнаму брату. Маладому чалавеку пагражае пазбаўленне волі тэрмінам да трох гадоў.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**
*rs@zviazda.by*

Даты | Падзеі | Людзі

**27 ВЕРАСНЯ**



**1822** год — французскі лінгвіст Жан-Франсуа Шампальён, выступаючы з дакладам перад членамі парыжскай Акадэміі надпісаў і славеснасці, паведаміў пра тое, што ён навучыўся расшыфроўваць старажытнаегіпецкія іерогліфы. Гэта дасягненне стала вынікам яго шматгадовага вывучэння трохмоўных надпісаў на Разецкім камені. У 1824 годзе Шампальён апублікаваў галоўную працу свайго жыцця пад назвай «Нарыс іерагліфічнай сістэмы старажытных егіпцян», якая стала краевугольным каменем сучаснай егіпталогіі.

**1825** год — у Англіі па маршруце Дарлінгтан — Стоктан прайшоў першы ў свеце паравоз. Яго канструкцыю распрацаваў інжынер Джордж Стэфенсан. Ён стаў і першым машыністам свайго стварэння, якое атрымала назву «Лакамоўшн». Падчас першага рэйсу паравоз прывёз вагоны з чатырмастамі пасажырамі, хуткасць руху дасягнула 24 км/г.

**1896** год — 120 гадоў таму нарадзіўся (г. Гродна) Аляксей Інакенцевіч Антонаў, савецкі ваенны дзеяч, генерал арміі. Удзельнік Першай сусветнай і Грамадзянскай войнаў. У Вялікую Айчынную — начальнік штаба Паўднёвага, Паўднёва-Каўказскага і Закаўказскага франтоў, Чарнаморскай групы войскаў, першы намеснік начальніка Генштаба і начальнік Аператыўнага ўпраўлення, удзельнік распрацоўкі плана Беларускай наступальнай аперацыі, іншых важных аперацый. З 1945 года — начальнік Генштаба Чырвонай Арміі. Удзельнік Крымскай і Берлінскай (Патсдамскай) канферэнцый. З 1955 года — начальнік штаба Аб'яднаных узброеных сіл дзяржаў — удзельніц Варшаўскага Дагавора. Памёр у 1962 годзе. Пахаваны на Краснай плошчы ў Маскве.



**1897** год — нарадзілася (г. Мінск) Ірма Пятроўна Яўнзем, беларуская і расійская спявачка, збіральніца народных песень, заслужаная артыстка Беларусі. Вучылася ў Петраградскай кансерваторыі. З 1921 года працавала ў Мінску, у канцэртах выконвала запісаныя ёй беларускія народныя песні. З 1923 года выкладала ў Беларускай драматычнай студыі ў Маскве, у 1925—1963 гадах — артыстка Маскоўскай філармоніі. Першая ў СССР пачала выконваць песні народаў свету на нацыянальных мовах, у рэпертуары больш за 5 тысяч узораў песеннай творчасці больш як 60 народаў свету, у тым ліку апрацоўкі беларускіх кампазітараў. Памерла ў 1975 годзе.

**1936** год — 80 гадоў таму нарадзіўся (вёска Рачкевічы Капыльскага раёна) Іван Канстанцінавіч Копцік, вучоны-селекцыянер, доктар сельскагаспадарчых навук, заслужаны работнік сельскай гаспадаркі Беларусі. Аўтар навуковых работ па селекцыі і стварэнні сістэмы сартоў азімай пшаніцы, распрацоўцы тэхналогіі атрымання збожжа. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі.

**Было сказана**

**Сяргей ГРАХОЎСКІ, паэт:**
*«Другіх не папракай і не вучы,
А паспрабуй сябе перамагчы!»*

## СЁННЯ

### Сонца

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 7.05 | 18.55 | 11.50 |
| Віцебск — | 6.54 | 18.44 | 11.50 |
| Магілёў — | 6.55 | 18.45 | 11.50 |
| Гомель — | 6.51 | 18.42 | 11.51 |
| Гродна — | 7.20 | 19.10 | 11.50 |
| Брэст — | 7.20 | 19.11 | 11.51 |

### Месяц

*Апошняя квадра 23.09—30.09.*
*Месяц у сузор'і Льва.*

### Імяніны

*Пр. Івана, Мікалая.*
*К. Вінцэнта, Космы.*



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

## ЗАЎТРА




### ...у суседзяў

| | | |
|---|---|---|
| ВАРШАВА +16..+18°С | КІЕЎ +13..+15°С | РЫГА +12..+14°С |
| ВІЛЬНЮС +13..+15°С | МАСКВА +9..+11°С | С.-ПЕЦЯРБУРГ +10..+12°С |

## УСМІХНЕМСЯ

**Гэта былі такія выхадныя...**
**Пасля якіх патрэбныя яшчэ выхадныя...**

— Я ў спартзалу па панядзелках не хаджу.
— А чаму?
— Разумееш, многія людзі па панядзелках пачынаюць новае жыццё, таму я прыходжу ў аўторак — новае жыццё ў іх ужо скончылася і ў зале пуста.

**Сядзім такія з Машкай ў інтэрнэце ў сацыяльных сетках, сумуем.**
**І тут раптам — бац: Брэд Піт з Таджыкістана дружбу прапануе!**

Дзве сяброўкі.
— Я ўчора палец прышчаміла. Балюча.
— Плакала?
— Не.
— Малайчына! Чаму не плакала?
— Дома нікога не было...




Малюнак Аляксандра КАРШАКЕВІЧА.

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.
РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. ДРЫЛА, Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), В. МЯДЗВЕДЗЕВА (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК (намеснік галоўнага рэдактара).
Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».
НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.
ТЭЛЕФОНЫ: прыёмная – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 284 44 04, падпіскі і распаўсюджвання — 284 44 04, бухгалтэрыі: 287 18 81.
Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.
http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zviazda.by,
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by
Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.
Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.
Тыраж 20.008. Індэкс 63850. Зак. № 3867.
Нумар падпісаны ў 19.30 26 верасня 2016 года.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12